**УДК 355.432.1** **Джу Пэйдзя**
*магістрант гістарычнага факультэта БДУ*
**Навуковы кіраўнік:** **Маскевіч Г. І.**
*загадчык кафедры гісторыі Беларусі*
*новага і навейшага часу БДУ,*
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт*

# УДЗЕЛ УРАДЖЭНЦАЎ КІТАЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ НАСТУПАЛЬНАЙ АПЕРАЦЫІ «БАГРАЦІЁН» (НА ПРЫКЛАДЗЕ ЛЁТЧЫКА ТАН ДУО)

***Анатацыя***: *у артыкуле разглядаецца ўдзел кітайскага лётчыка Тан Дуо ў беларускай наступальнай аперацыі «Баграціён» праз аналіз зместу яго ўспамінаў, якія адносяцца да перыяду Вялікай Айчыннай вайны.*

***Summary***: *the article discusses the participation of Chinese pilot Tang Duo in belarusian offensive operation «Bagration» through the analysis of the content of his memoirs relating to the period of the Great Patriotic War.*

***Ключавыя словы***: *аперацыя «Баграціён», баявы шлях, Вялікая Айчынная вайна, кітайскі лётчык, Тан Дуо.*

***Key words***: *operation Bagration, combat path, The Great Patriotic War, Chinese pilot, Tang Duo,.*

З заканчэння Другой сусветнай вайны мінула 80 гадоў, але вайна была настолькі маштабнай і разнапланавай падзеяй, што цікавасць да яе вывучэння не слабее, а ўзмацняецца з часам. У гады Другой сусветнай вайны народы Кітая і Беларусі падтрымлівалі адзін аднаго, ваявалі плячо да пляча. Беларусы ў складзе Савецкай арміі ваявалі ў Кітаі з японскай арміяй падчас паветраных баёў, а таксама баявых аперацый на паўночным усходзе Кітая [1]. З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны ўраджэнцы Кітая ўступілі ў барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, пазней унеслі ўклад у

вызваленне Беларусі. Адзін з такіх прыкладаў – лётчык Тан Дуо.

Тан Дуо (1904–1983 гг.) быў адным з першых камуністаў Кітая, якія прысвяцілі сябе лётнай справе. Вясной 1923 г. Тан Дуо стаў стажорам на авіяцыйным заводзе ў горадзе Гуанджоў у Кітаі, праз год быў накіраваны на вучобу ў Гуандунскае ваенна-паветранае вучылішча. У канцы лета 1925 г. пасля заканчэння вучобы Тан Дуо і яшчэ некалькі выпускнікоў былі накіраваны ў СССР для працягу вучобы. Падчас стажыроўкі ў СССР Тан Дуо вучыўся спачатку ў 2-й ваеннай школе лётчыкаў Чырвонага паветранага флоту, затым у Серпухаўской ваеннай авіяцыйнай школе паветранага бою, у 3-й ваеннай школе лётчыкаў і лётчыкаў-назіральнікаў, Маскоўскім авіяцыйным вучылішчы сувязі і ў Ваенна-паветранай інжынернай акадэміі імя М.Я. Жукоўскага [2, с. 256–263].

Паведамленне пра пачатак Вялікай Айчыннай вайны Тан Дуо сустрэў 22 чэрвеня 1941 г. раніцай, калі пайшоў у краму: «Раптам па радыё ў краме пачуліся гнеўныя галасы: фашысцкая Германія вераломна напала на нашу краіну і ўварвалася ў нашу краіну на дзясяткі кіламетраў…» [3, с. 30]. Потым ён і яго аднакурснікі напісалі ліст І.В. Сталіну, у якім прасілі адправіць іх на фронт. Аднак яго жаданне спраўдзілася толькі летам 1944 г. Атрымаўшы прызначэнне намеснікам эскадрыллі 74-га гвардзейскага штурмавога авіяпалка 1-й паветранай арміі 3-га Беларускага фронту, ён адразу ж адправіўся на службу ў авіяцыю на тэрыторыю Беларусі [2, с. 264–265].

23 чэрвеня 1944 г. пачалася Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён» [4, с. 160]. Тан Дуо ўдзельнічаў у гэтай аперацыі ў складзе 74-га гвардзейскага штурмавога авіяцыйнага палка. Спачатку ён лётаў на бамбардзіроўшчыку «Пе-2» у некалькіх баях, у асноўным прыкрываючы наступ пяхоты і інтэнсіўна бамбардзіруючы варожыя ўмацаванні. Потым ваяваў на штурмавіку «Іл-2».

Тан Дуо ўспамінаў: «Аднойчы мне далі заданне: вылецець у раён баявых дзеянняў і на малой або гранічна малой вышыні атакаваць варожыя цэлі. Разам з лётчыкам лейтэнантам Мартынавым лётаў на самалёце «Іл-2», калі наблізіўся да зоны баявых дзеянняў, камандуючы войскамі загадаў падарваць мост, па якім адступаў праціўнік. Я зарыентаваўся, адкрыў агонь з кулямёта і аўтамата, а затым скінуў бомбы, самалёт тым часам апусціў насавую частку і перайшоў у пікіраванне. Пакуль падымаўся на самалёце, лейтэнант Мартынаў вёў агонь па мосце з кулямёта, які мог паварочвацца на 360 градусаў. Калі я азірнуўся на мост, ён ужо быў узарваны» [3, с. 33]. Часам Тан Дуо рабіў 3–5 такіх баявых вылетаў на дзень.

Потым Тан Дуо ў складзе 74-га гвардзейскага штурмавога авіяпалка ўдзельнічаў ва Усходне-прускай аперацыі. Пасля вайны яго накіравалі выкладчыкам у Пермскае ваеннае авіяцыйна-тэхнічнае вучылішча ВПС. За 28 гадоў жыцця ў СССР Тан Дуо быў уганараваны многімі ўзнагародамі, сярод якіх ордэны Леніна, Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны, а таксама медалі «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй» і «30 гадоў Савецкай Арміі і Флоту».

Падводзячы вынік, можна сказаць, што ў гады барацьбы з агрэсарамі народы Кітая і Беларусі разам ваявалі і разам перамаглі ў Другой сусветнай вайне. Падчас Вялікай Айчыннай вайны кітайскі лётчык Тан Дуо актыўна прымаў удзел у Беларускай наступальнай аперацыі «Баграціён», што выступае важным сведчаннем баявога брацтва паміж Кітаем і Беларуссю.

## СПІС КРЫНІЦ:

*1. Государственный визит Председателя КНР Си Цзиньпина в Беларусь : [сайт]. – Минск, 2025. – URL: https://president.gov.by/ru/events/gosudarstvennyj-vizit-predsedatelja-knr-si-tszinpina-v-belarus-11366 (дата обращения: 22.02.2025).*

2. *中国中共党史人物研究会著. 中共党史人物传 第 42 卷[M]. 北京：中国人民大学出版社, 2017. (Кітайскае таварыства па вывучэнні дзеячаў гісторыі Камуністычнай партыі Кітая. Біяграфіі дзеячаў гісторыі Камуністычнай партыі Кітая, т. 42. / Пекін: выдавецтва універсітэта Рэнмін Кітая, 2017.)*

3. *唐铎，徐建源. 我亲身经历的苏联卫国战争[J].党史纵横,2015,(2): 30-36. (Тан До, Сюй Цзяньюань. Вялікая Айчынная вайна, як я яе перажыў. / Тан До, Сюй Цзяньюань // Панарама гісторыі партыі. –2015. – № 2. – С. 30-36.)*

4. *Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): вучэб. дапам. для 9 (11) кл. установ агул. сярэд. адукацыі з бел. мовай навучання / А. А. Каваленя [і інш.] ; пад рэд. А. А. Кавалені. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2022. – 246 с.*